✓ **14 красавіка** ў Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага адбылося адкрыццё фотавыставы **«Нацыянальная бібліятэка Беларусі»**. Экспазіцыя прадстаўляе 24 працы вядомых фотамастакоў Беларусі: Анатоля Дрыбаса, Лолія Македонскага, Сяргея Плыткевіча, Віктара Суглобы і інш. Аўтары ў яркай мастацкай форме паказваюць новую старонку стогадовай гісторыі галоўнай бібліятэкі краіны і яе новы будынак у самых яркіх і значных фрагментах, раскрываюць арыгінальныя рашэнні інтэр'ераў, новыя тэхналогіі ў абслугоўванні, знаёмяць з творамі жывапісу і прыкладнога мастацтва. У адкрыцці выставы ўзяла ўдзел генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава. Яна падзякавала кіраўніцтву абласной бібліятэкі за магчымасць пазнаёміць жыхароў Брэста з гісторыяй «алмазу ведаў», яго архітэктурнымі асаблівасцямі і мастацкім афармленнем. Мерапрыемства накіравана на пашырэнне ўяўлення аб сучаснай бібліятэцы, прафесіі бібліятэкара, якая імкліва відазмяняецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Выстава будзе дэманстравацца на працягу месяца.